**Тэма урока. Зваротак як сродак маўленчага этыкету**
(8 клас, вучні з цяжкімі парушэннямі маўлення)

**Т. А. Капцюг,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Вілейскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната

**Задачы:**

- ✓ дапамагчы вучням выпрацаваць уменне правільна карыстацца зваротkам у маўленні, навучыць з дапамогай звароткa выражаць свае адносіны да суразмоўцы;
- ✓ выпрацоўваць навыкі напісання віншавання з якой-небудзь нагоды;
- ✓ удасканальваць уменні адэкватна ацэньваць разнастайныя маўленчыя сітуацыі і захоўваць правілы маўленчых паводзін;
- ✓ стварыць умовы для выхавання маўленчага этыкету.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

## Ход урока

I. **Арганізацыйны момант**

Прывітанне, дзеці. Давайце павітаемся пальчыкамі, плечыкамі, галоўкамі, носікамі. І ўсміхнёмся адін аднаму. Настрой узняўся? Старажытныя грэкі казалі: “Добры настрой – палова перамогі”. Я жадаю вам сёння на ўроку атрымаць перамогу ў барацьбе за веды.

***Маўленчая размінка***

| | |
|---|---|
| Жа – жо – жу – жы.<br>Роднай мовай даражы. | Ра – ро – ру – ры.<br>Роднай мовай гавары. |
| Ша – шо – шу – шы.<br>Наша мова для душы. | Ча – чо – чу – чы.<br>Мову трэба берагчы. |

II. **Праверка дамашняга задання**

На папярэдніх уроках мы вывучалі тэму “Зваротак”. Вы павінны былі падрыхтаваць кластары. (Кластары дзяцей вывешваюцца на дошку, аналізуюцца.)




***Лічбавы дыктант***

Давайце ўспомнім асноўны тэарэтычны матэрыял.

(Настаўнік чытае сказы. Калі вучні згодны са сцвярджэннем, пішуць лічбу1. Калі не згодны, пішуць 0)

1. Зваротак адказвае на пытанне *хто*?( *што*?) і абазначае таго, хто выконвае дзеянне.

2. Зваротак часцей за ўсё ужываецца ў гутарковым, мастацкім, публіцыстычным стылях.

3. Зваротак часта ўжываецца ў навуковым стылі.

4. Звароткі бываюць развітыя і неразвітыя.

5. Звароткі могуць выражацца прыслоўем.

6. Зваротак часцей за ўсё выражаецца назоўнікам, прыметнікам, дзеепрыметнікам.

7. Зваротак з’яўляецца членам сказа.

8. У склад зваротка ўваходзяць займеннікі ты, вы.

(Ключ: 01010100.)

***Белыя плямы***

Ці можа зваротkам быць неадушаўлёны прадмет? Як называецца такі троп у літаратуры? (Увасабленне.) Устаўце звароткі ўтэксты вядомых вам вершаў.

<table>
<tr><td>О … … , … … ,<br>… … … … !<br>Што мілей у свеце божым<br>Гэтых светлых берагоў.<br>Якуб Колас<br><br>(край родны, край прыгожы,<br>Мілы кут маіх дзядоў!)</td><td>Здароў, … , … … .<br>Здароў, … , … … .<br>Мяцель не вее, сціхнуў вецер,<br>І волен лёгкіх санак бег.<br>Максім Багдановіч<br><br>(марозны, звонкі вечар.<br>скрыпучы, мяккі снег)</td></tr>
<tr><td colspan="2">… …, … … , … … !<br>Улажылі спаць мяне вы на зямлі.<br>Не курыцца светлы пыл усцяж дарог.<br>У небе месяца праглянуў бледны рог,<br>У небе ціха зоркі расцвілі.<br>Максім Багдановіч<br>(Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог!)</td></tr>
</table>

III. **Паведамленне тэмы, вызначэнне задач урока**

Прачытайце тэму ўрока. Як вы разумееце значэнне слоў *маўленчы этыкет*? (Маўленчы этыкет – правілы маўленчых паводзін.)

Вызначце задачы ўрока.

Прачытайце эпіграф. Якога слова не хапае?

*Нішто не абыходзіцца нам так танна і не ацэньваецца так дорага, як …* (ветлівасць). М. Сервантэс

(Калі дзеці не вызначылі, звяртаемся да эпіграфа ў канцы ўрока.)

Якімі павінны быць людзі падчас маўленчых адносін? Падбярыце словы-сінонімы. (Ветлівыя, добразычлівыя, далікатныя, тактоўныя, уважлівыя, прыязныя.

Словы прымацоўваюцца да дошкі.) Мы сёння пастараемся быць такімі пры ўжыванні зваротка.

IV. **Матывацыйны этап**

Прачытайце дыялог:

- *Гэй, ты, не скажаш, дзе тут знаходзіцца пошта?*

- *Пошта зусім блізка, прайдзіце, калі ласка, крышку далей і справа ўбачыце будынак пошты.*

Як вы ацэніце суразмоўцаў? Ці можна першага назваць ветлівым чалавекам? Чаму?

Словы і звароты ветлівасці упрыгожваюць зносіны паміж людзьмі, задаюць тон у размове. Чалавек, які валодае моўным этыкетам, стварае вакол сябе атмасферу добразычлівасці, ён праграмуе станоўчыя эмоцыі. Калі ж чалавек не ведае правілаў зносін, тон яго размовы заніжана-грубаваты. Нізкая культура маўлення можа сапсаваць настрой, пакрыўдзіць чалавека, паставіць яго ў няёмкае становішча.

А ці ведаеце вы ветлівыя словы? Давайце правядзём аўкцыён ветлівых слоў (2 каманды па чарзе называюць ветлівыя словы.)

V. **Засваенне новага матэрыялу**

Зваротак – самы яркі этыкетны знак, бо слова “этыкет” у першапачатковым французскім значэнні – “этыкетка”, “ярлык”. Называючы суразмоўцу, мы як бы выбіраем яму найбольш прыдатны ярлык.

Зварот да асобы ў залежнасці ад

полу — узросту — прафесіі — сваяцкіх адносін

Як вы звернецеся да дзяцей? (Хлопчык, дзяўчынка. Дзеці.)

Як вы звернецеся да моладзі? (Малады чалавек, хлопец, дзяўчына, маладыя людзі, хлопцы, дзяўчаты.)

Як вы звернецеся да групы людзей? (Таварышы, грамада, калегі, грамадства, спадары, спадарства.)

Як вы звернецеся да знаёмых вам людзей? (Цётка Ганна, дзядзька Іван.)

Не вельмі ветліва звяртацца да незнаёмых дарослых словамі *мужчына, жанчына*. Лепш за ўсё ў такіх выпадках выкарыстоўваць формы *будзьце ласкавыя, калі ласка, прашу вас, прабачце.* Можна ўжываць звароты: спадар, спадарыня, таварыш.

У многіх краінах ёсць пастаянныя звароты да людзей. У Польшчы: пан – пані; у Францыі: мсье – мадам; у Англіі: містэр – міс, лэдзі – джэнтльмен; у Іспаніі: сеньёр – сеньёра. У Беларусі пакуль што не ўстанавіліся пастаянныя формы звароту, мабыць, у будучым такія словы ўзнікнуць.

Ці аднолькава мы будзем звяртацца да родных, блізкіх і да чужых людзей, афіцыйных асоб? Самастойнае вывучэнне правіла на с.192 – 193.

**VI. Замацаванне**

<u>Першасная праверка разумення навучальнага матэрыялу</u>

***Заданне “Упрыгожваем слова”.*** Звярніцеся да мамы, падбярыце прыгожыя, ласкавыя словы.

| Зварот да блізкіх людзей | Зварот да афіцыйных асоб |
|---|---|
| дарагая<br>любімая<br>родная<br>мілая<br>слаўная<br>адзіная | шаноўны<br>паважаны<br>глыбокапаважаны |

<u>Знаходжанне і тлумачэнне моўнай з’явы</u>

Пр. 274 (вусна) – знайсці звароткі ў лістах Якуба Коласа. Якія адносіны выражае аўтар да сваіх адрасатаў?

***Падбор звароткаў***. Пр. 275 – уставіць словы, зрабіўшы звароткі развітымі.

Канструяванне сказаў са зваროткамі – пр. 280.

***Складанне і інсцэніроўка дыялогаў***

| | |
|---|---|
| На вуліцы<br>- Таварыш міліцыянер! Скажыце, калі ласка, як прайсці да кінатэатра.<br>- Вельмі проста, ідзіце прама, на плошчы Леніна павярніце направа і ўбачыце кінатэатр.<br>- Дзякуй, таварыш міліцыянер! | У бібліятэцы<br>- Добры дзень, Вольга Анатольеўна.<br>- Добры дзень, Саша.<br>- Я прынёс здаць аповесць В.Быкава “Жураўліны крык”<br>- Спадабалася яна табе?<br>- Вельмі. Дайце яшчэ, калі ласка, якую-небудзь кнігу В.Быкава.<br>- Ну, вось вазьмі “Альпійскую баладу”.<br>- Дзякую, Вольга Анатольеўна.<br>- Чытай, Саша, на здароўе. |
| У доктара<br>- Добры дзень, доктар. Скажыце, калі ласка, як стан здароўя маёй сястры? Яна ляжыць у 15 палаце, Грэль Алеся.<br>- Ужо лепш, кашаль яшчэ трымаецца, але тэмпературы ўжо няма.<br>- А якія вы параіце ёй прадукты?<br>- Вітаміны, садавіну.<br>- Дзякую, доктар. | Размова па тэлефоне<br>- Добры дзень! Гэта кватэра Івановых?<br>- Так.<br>- Прывітанне, Ніна Іванаўна. Гэта Андрэй. Пазавіце, калі ласка, Віцю.<br>- А яго няма дома.<br>- Тады перадайце яму, каб мне патэлефанаваў.<br>- Добра, перадам.<br>- Да пабачэння.<br>- Да пабачэння. |

**Фізкультхвілінка.** Адзін вучань выконвае рухі, астатнія паўтараюць:

Я – чалавек, заўсёды гатовы прывітаць знаёмага (ківок галавой), павярнуцца да таго, хто побач (паварот тулава), працягнуць руку дапамогі (руку ўперад), нахіліцца да слабага (нахіл уніз), павярнуцца да таго, хто адстаў (паўабарот тулава назад), пераскочыць праз перашкоды (скачок на месцы і прысесці), падняцца пасля няўдачы (пад’ём уверх), дасягнуць да мары, да сонца (рукі ўверх), узяць праменьчык сонца і пакласці яго ў сэрца сабе і другім (руку да сэрца).

***Праблемная сітуацыя***

Заданне ў канверце. Групы выбіраюць сабе 1 заданне і абмяркоўваюць яго, выступаюць з рашэннем праблемнай сітуацыі.

| | |
|---|---|
| Званок па тэлефоне. Мама падымае трубку.<br>- Мне Мішу! | На калідоры стаяць 2 настаўнікі і размаўляюць. Вам трэба ў іх штосьці спытаць.<br>Як вы гэта зробіце? |

***Бліц-апытанне.*** Кожная каманда па чарзе адказвае на пытанні.

Як вы звернецеся да дэлегатаў канферэнцыі? (Паважаныя дэлегаты канферэнцыі.)

Да гасцей у актавай зале на вечары сустрэчы з выпускнікамі? (Паважаныя настаўнікі, дарагія сябры.)

Да вадзіцеля таксі, аўтобуса? (Таварыш вадзіцель, таварыш таксіст.)

Да аднакласнікаў на класным сходзе? (Дзеці, сябры.)

Да выпускнікоў школы перад апошнім званком? (Дарагія выпускнікі.)

***Праверачны тэст “пераблытаныя ланцужкі”***

(Дзеці выконваюць на картках, праверка па слайдзе.)

Устанавіце адпаведнасць, суаднясіце словы

| | |
|---|---|
| шаноўныя | першакласнікі |
| дарагі (я) | міліцыянер |
| таварыш | татачка |
| мілая | Марыя Анатольеўна |
| паважаная | мамачка |
| родны (я) | педагогі |

VII. **Творчая праца – напісанне паштоўкі**

З якой нагоды пішуцца паштоўкі? Для чаго яны патрэбны? З якіх частак складаецца паштоўка? (1. Прывітальны зварот. 2.Віншаванне. 3.Пажаданне. 4.Подпіс.)

Як пішуцца назвы святаў паводле новых правілаў арфаграфіі? (Першае слова з вялікай літары.)

*Прадстаўленне работ.*

22 сакавікаадзначаецца народнае свята – Саракі. У гэты дзень жанчыны пяклі 40 жавараначкаў, піражкоў у выглядзе птушак. Дзеці бегалі па вёсцы, высока трымаючы птушачак, або нанізвалі іх на пруток і клікалі вясну. Сімвал Саракоў – птушачка. Давайце на выявах жавараначкаў звернемся да нашых гасцей і напішам ім пажаданні. (Дзеці пішуць гасцям пажаданні на выразаных фігурках птушак.)

VIII. **Рэфлексія “Закончы сказ”**

Мы сёння — даведаліся …
— навучыліся …

можам прымяніць веды …

Мне спадабалася …

Я сёння працаваў …

IX. **Выстаўленне адзнак**

Давайце успомнім, што такое зваротак і з якімі пачуццямі яго трэба ўжываць. (Падбор слоў да кожнай літары слова зваротак.)

**З** – зычлівасць, зацікаўленасць

**В** – ветлівасць

**А** – адкрытасць, далікатнасць

**Р** – разважлівасць

д **О** бразычлівасць

**Т** – тактоўнасць

ув **А** га

**К** – культура

Англійскаму філосафу Дж.Локу належаць словы: “Выхаванне чалавека залежыць ад асяроддзя. Добрыя якасці ствараюць багацце душы”. Давайце будзем ствараць вакол сябе асяроддзе ветлівасці, зычлівасці, тактоўнасці, дабрыні, спагады, і тады мы будзем багатыя душой. Я дзякую вам за працу.

X. **Дамашняе заданне**

Напісаць пісьмо сябру.

# ЗВАРОТАК
# ЯК СРОДАК
# МАЎЛЕНЧАГА ЭТЫКЕТУ

***Капцюг Таццяна Аляксееўна,***
*настаўніца беларускай мовы і літаратуры*

ЖА – ЖО – ЖУ – ЖЫ.

Роднай мовай даражы.

ША – ШО – ШУ – ШЫ.

Наша мова для душы.

РА – РО – РУ – РЫ.

Мовай роднай гавары.

ЧА – ЧО – ЧУ – ЧЫ.

Мову трэба берагчы.

# ЗВАРОТАК

Спосаб выражэння

Спосаб ужывання

Будова

Месца ў сказе

Сродкі выдзялення

# ЛІЧБАВЫ ДЫКТАНТ

0 1 0 1 0 1 0 0

# БЕЛЫЯ ПЛЯМЫ

О…………………… , ……………………….. ,

………………………………………………………….!

Што мілей у свеце божым

Гэтых светлых берагоў…

Я.Колас

# Белыя плямы

О край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў…

Я.Колас

Здароў,……………. , ………………….. !
Здароў, ………….. , ………………….. !
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

М. Багдановіч

Здароў,марозны, звонкі вечар!
Здароў,скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

М.Багдановіч

Цёплы …….. , ……………… , ……………… ,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца праглянуў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.

М. Багдановіч

Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца прагляну́ў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.

М.Багдановіч

# ЗВАРОТАК
# ЯК СРОДАК
# МАЎЛЕНЧАГА ЭТЫКЕТУ

МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ -

- правілы маўленчых паводзін



- Гэй , ты , не скажаш, дзе тут знаходзіцца пошта ?
- Пошта зусім блізка,прайдзіце, калі ласка, метраў 500 і справа ўбачыце яе будынак.

# Зварот да асобы ў залежнасці ад

- полу
- узросту
- прафесіі
- сваяцкіх адносін

# Зварот да дзяцей



***Хлопчык***



***дзяўчынка***



***Дзеці***

# Зварот да моладзі







*Малады чалавек*

*дзяўчына*

*маладыя людзі*

*хлопец*

*дзяўчаты*

*хлопцы*

# Зварот да групы людзей

- *Таварышы*
- *Грамада*
- *Калегі*
- *Грамадства*
- *Спадары*
- *Спадарства*



# Зварот да знаёмых людзей



**дзядзька Іван**



**цётка Ганна**

# Зварот да незнаёмых людзей

Будзьце ласкавыя, …
Калі ласка , ……
Прашу вас , …..
Прабачце, …….

***Спадар***
***Спадарыня***
***Таварыш***




ЗВАРОТ ДА БЛІЗКІХ ЛЮДЗЕЙ
ДАРАГАЯ
ЛЮБАЯ
РОДНАЯ
МІЛАЯ
СЛАЎНАЯ
АДЗІНАЯ


Зварот да афіцыйных асоб
Шаноўны
Глыбока-паважаны
Паважаны

# Перабблытаныя ланцужкі

| | |
|---|---|
| Шаноўныя | першакласнікі |
| Дарагі(я) | міліцыянер |
| Таварыш | татачка |
| Мілая | Марыя Анатольеўна |
| Паважаная | мамачка |
| Родны (я) | педагогі |

# Пераблытаныя ланцужкі

| | |
|---|---|
| Шаноўныя | педагогі |
| Дарагія | першакласнікі |
| Таварыш | міліцыянер |
| Мілая | мамачка |
| Паважаная | Марыя Анатольеўна |
| Родны | татачка |

# Паштоўка

1. Прывітальны зварот
2. Віншаванне
3. Пажаданне
4. Подпіс



# Віншаванне са святам

з Днём  Перамогі

з Днём настаўніка

з Новым годам

з Міжнародным жаночым днём

з Днём абаронцы Айчыны

з днём нараджэння

з Вялікаднем

са Святам вясны



# Рэфлексія

Мы сёння
- даведаліся …………
- навучыліся …………
- можам прымяніць
- веды ……………………

Мне спадабалася …………………………….

Я сёння працаваў……………………………….

З — зацікаўленасць,зычлівасць

В — ветлівасць

А — адкрытасць

Р — развадлівасць

дОбразычлівасць

Т — тактоўнасць

пАвага

К — культура



ВЫХАВАННЕ ЧАЛАВЕКА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД АСЯРОДДЗЯ.

ДОБРЫЯ ЯКАСЦІ СТВАРАЮЦЬ БАГАЦЦЕ ДУШЫ.

Дж. Лок